Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю БДПУ імя М. Танка

Мінск, 25 кастрычніка 2002 г.

Выпуск 2

Мінск
2002

в отношении Франции и Италии правящими кругами Америки при участии Англии, — не смогли помешать Французскому национальному собранию отклонить договор о ЕОС. Несмотря на отрицательное решение французского парламента западные державы продолжали политику непосредственного вовлечения ФРГ в НАТО. В конечном итоге правительство Франции дало согласие на перевооружение Германии и ее допуск в Североатлантическое сообщество. США и Великобритания одержали первую победу над своими союзником по НАТО.

Подписание парижских соглашений означало: во-первых, прекращение оккупации Западной Германии, во-вторых, полное включение ФРГ в военную систему Запада, в-третьих, создание западногерманской полумиллионной армии в составе и под контролем НАТО.20 апреля 1955 года Парижские соглашения были ратифицированы ФРГ. 5 мая 1955 года они вступили в силу. ФРГ достигло одной из существенных целей своей политики. Но вопрос об объединении Германии, по существу, был снят с повестки дня со всеми вытекающими отсюда последствиями для положения в Европе и во всем мире.

ФРГ стала полностью дееспособной как во внешней политике, так и в международно-правовой сфере.

**Литература**


1. Архив внешней политики РФ. Ф.082. Оп.41. П.271. Д.18.
2. Архив внешней политики РФ. Ф.082. Оп.43. П.309. Д.60.
3. Берлинское совещание министров иностранных дел четырех держав — СССР, Великобритании, США и Франции (25 января — 18 февраля 1954 года). Документы и протоколы. М., 1954.
4. История европейской интеграции. (1945 — 1994). М., 1995.
5. Новик Ф.И. «Оттепель» и инерция холодной войны (Германская политика СССР в 1953 — 1954 гг.). М., 2001.
6. Britain in Wersten Europe. WEU and Atlantic Alliance. A Repot by a Study Group of Royal Institute of International Affairs. London and N.Y., 1956.
7. Documentary History of the United States. America in a Divided World. 1945 — 1972. N.Y., 1975.
8. Documents on Germany, 1944 – 1985. Washington, 1985.
9. Major Problems of the United States Foreign Policy 1954. Wisconsin, 1954.
10. Paris, Conference. London. 1954.
11. The Department of State Bulletin. Washington, 1954.
12. The Memoirs of Sir Anthony Eden. Full Circle. London, 1960.
1. The New York Times, 30.IX.1954.
14. The New York Times, 30.VIII.1954.


## НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў МІНСКІМ ПЕРЫЯДЫЧНЫМ ДРУКУ У 1906-1917 гг.


**П. А. Трубчык, Мінск**


Перыядычныя выданні, якія выходзілі ў Мінску ў міжрэвалюцыйны перыяд 1906 – 1917 гг. у апошні час выклікаюць значную цікавасць сярод даследчыкаў. Аналіз іх дазваляе прасачыць тую палітычную сітуацыю, якая склалася ў вызначаны час у Беларусі.



У гістарычнай літаратуры гэта тэма спецыяльна не даследавалася. Яна часткова разглядалася ў працах М. В. Біча [1, 422-428], У. М. Конана [2] і М. М. Забаўскага [3, 100-113] і інш.

За перыяд 1906-1917 гг. у Мінску выходзіла больш за 60 перыядычных выданняў. У абсалютнай большасці гэта былі рускамоўныя органы друку манархічных партый і акцябрыстаў ("Минская речь", "Минские губернские ведомости", "Минское русское слово", "Минское слово" і інш.), а таксама газеты пракадэцкай накіраванасці ("Голос провинции", "Жизнь провинции", "Окраина", "Минский курьер", "Минское эхо", "Минский голос" і інш.). На беларускай мове ў гэты час у Мінску выходзілі толькі два выданні: сельскагаспадарчы часопіс "Саха" (ліст. 1913 – 1915 гг.) і часопіс літаратурна-мастацкага накірунку "Лучынка" (1914 г.)

Пры пастаноўцы і вырашэнні асноўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны, асабліва нацыянальнага, якое набыло ў перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. у Беларусі значную актуальнасць, манархічны і ліберальны друк, як правіла, прытрымліваўся процілеглых пазіцый. Першыя выданні поўнасцю падтрымалі царскі ўрад у правядзенні палітыкі вялікадзяржаўнага шавінізму, накіраванай ў краі супраць палякаў, яўрэяў і беларускага нацыянальнага руху.

Праваакцябрысцкая "Минская речь" (студз. – ліст. 1906 г.) у праграмным артыкуле заяўляла, што будзе выступаць за "свабоду і парадак" на аснове прынцыпаў, вызначаных царскім маніфестам ад 17 кастрычніка 1905 года. У шэрагу артыкулаў падкрэслівала, што адным з асноўных палажэнняў мінскага камітэта "Саюза 17 кастрычніка" з'яўляецца "захаванне адзінства і непадзельнасці дзяржавы з адхіленнем усялякіх прапаноў, накіраваных прама або ўскосна да адасаблення асобных яе частак у аўтаномныя правінцыі" [4].

Пераемнікам "Минской речи" з 1906 года стала газета "Минское слово" (ліст. 1906 – чэрв. 1912 гг.). Спачатку яна арыентавалася на правых акцябрыстаў, аднак пасля смерці ў 1907 годзе галоўнага рэдактара Г. Шміда, "Минское слово" перайшло ў рукі яго пераемніка Д. Скрынчанкі, які на гэты час з'яўляўся старшынёй мінскага аддзела "Саюза рускага народа" і карыстаўся падтрымкай мінскага епіскапа Міхаіла. Як і "Минская речь" газета выступала супраць раўнапраўя народаў Расіі, адмаўляла нацыянальную і этнакультурную самастойнасць беларусаў [5].

Мала чым адрознівалася па змесце ад сваіх папярэднікаў "Минское русское слово" (чэрв. 1912 – люты 1913 гг.) – орган Усерасійскага нацыянальнага саюза. Сама газета абвяшчала сябе органам "правага рускага друку, што грунтаваўся на прынцыпах самадзяржаўя, праваслаўя і народнасці [6]. У пачатку 1913 года з-за недахопу сродкаў газета вымушана была спыніць сваё існаванне. У апошнім нумары яна перадала сваю праграму газеце "Северо-западная жизнь".

Увогуле манархічны друк не меў папулярнасці у Беларусі і цалкам залежаў ад грашовых субсідый праўрадавых партый і груп. Тое ж "Минское слово" у апошнім нумары адзначала, што "некалькі дзён назад памёр епіскап Міхаіл, а сёння прыйшоў канец і "Минскому слову" [7].

Больш трывалае матэрыяльнае становішча мелі "Минские губернские ведомости", якія выдаваліся губернскім праўленнем з 1938 па 1917гг. Газета мела афіцыйны аддзел і неафіцыйны – "Минские ведомости". У першым змяшчаліся паведамленні і ўказы ўрада, распараджэнні губернскіх улад, аб'явы і г. д. У неафіцыйнай частцы газета падтрымлівала ўрадавую шавіністычную палітыку, выступала супраць беларускага нацыянальнага руху і прапагандавала адзінства царызму і народа.[2, 37].

Такім чынам, органы друку манархічнага накірунку, якія выходзілі ў Мінску ў адзначаны перыяд, з'яўляліся галоўным праваднікам палітыкі царызму ў краі. Гэтыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выданні падтрымлівалі інтарэсы "рускага" насельніцтва і вялі барацьбу з польскім і яўрэйскім панаваннем у краі.

Перыядычныя выданні пракадэцкай накіраванасці, па сутнасці, знаходзіліся ў апазіцыі к царызму.

Газета леваліберальнага накірунку "Голос провинции" (сакавік 1906 – красавік 1907 гг.), выдаўцамі якой з'яўляліся прысяжны паверанны Я. С. Залкінд, патомны дваранін І. М. Глоба-Міхайленка і мешчанін Ш. Б. Гінзбург, крытыкавала грамадска-палітычны лад Расіі [8]. Вясной 1907 года яна асудзіла шавіністычную палітыку ўрада П. Сталыпіна, за што была забаронена.

Аднак ужо ў красавіку гэтага ж года пачала выходзіць газета "Жизнь провинции" (крас. – май 1907 г.), рэдактарам якой з'яўляўся той жа Глоба-Міхайленка. На сваіх старонках газета выкрывала палітыку манархічных партый і мясцовага друкаванага органа "Минского слова". Яна прызнавала нацыянальную самастойнасць беларусаў і крытыкавала палітыку царызму і польскай буржуазіі на Беларусі [2, 45].

Сваю дзейнасць рэдактар-выдавец Л. І. Глоба-Міхайленка працягваў у газеце ліберальнага накірунку "Окраина" (ліпень 1907 – май 1908 гг.). Яна, выступаючы супраць палітыкі царызму, развівала праграму забароненай газеты "Жизнь провинции". Як і папярэднія апазіцыйныя выданні газета праз некаторы час была забаронена.

На працягу 1908 года ў Мінску выдавалася газета ліберальна-асветніцкага накірунку "Минский курьер". Рэдактарам і выдаўцом яе з'яўляўся В. І. Чавусаў. "Минский курьер" адрозніваўся ад папярэдніх выданняў больш высокім ідэйна-палітычным узроўнем сваіх артыкулаў. Газета выкрывала дзейнасць лідэра мінскіх чарнасоценцаў Г. Шміда. У сваіх артыкулах яна неаднаразова падкрэслівала класавую сутнасць шавіністычнай палітыкі ўрада, накіраваную на абарону інтарэсаў памешчыкаў і фабрыкантаў [9]. У выніку выхад газеты неаднаразова прыпыняўся, а праз некаторы час і ўвогуле яна была забаронена.

Больш памяркоўнай, у адрозненні ад сваіх папярэднікаў, з'яўлялася газета "Минское эхо" (май 1908 – вер. 1909 гг.). Рэдактарамі яе былі Л. Штэйнберг і Н. Свіцыч. Яна выступала за эвалюцыйнае развіццё грамадства на аснове раўнапраўя, адвяргала лозунг "Расія для рускіх", абгрунтоўвала неабходнасць буржуазна-дэмакратычных рэформ [2, 137].

Праграму "Минского эха" працягвала газета буржуазна-ліберальнага накірунку "Минский голос" (ліст. 1909 – 1918 гг.). Рэдактарамі яе з'яўляліся той жа Л. Штэйнберг, Ш. Эфрон і інш. У сваіх артыкулах газета адстойвала інтарэсы яўрэйскай абшчыны, выкрывала нападкі "Минского слова" на яўрэяў, палякаў і на беларускі культурна-нацыянальны рух [10].

Такім чынам, перыядычныя выданні ліберальнага накірунку займалі больш прагрэсіўныя пазіцыі ў вырашэнні асноўных пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краю. Аднак пасля рэвалюцыі 1905 –1907 гг. многія ліберальныя органы друку вымушаны былі спыніць сваё існаванне або перайсці на больш памяркоўныя пазіцыі ў адносінах да палітыкі царызму.

## Літаратура


1. Біч М. В. Барацьба за нацыянальнае адраджэнне. Нарысы гісторыі Беларусі:У 2 ч. Мн., 1994. Ч. І.
2. Конон В. М. Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в. Мн., 1985.
3. Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 –1917гг.). Мн., 1999.





4. Минская речь. 1906. 5 янв. № 3.
5. Минское слово. 1912. 17 марта. №1516.
6. Минское русское слово. 1912. 17 июня.
7. Минское слово. 1912. 15 июня. № 1585.
8. Голос провинции. 1906. 26 сент.
9. Минский курьер. 1908. 28 февр.; 1 марта.
10. Минский голос. 1910. 26 авг.


## НЕЛЕГАЛЬНАЯ ЭМІГРАЦЫЯ ПАМІЖ БССР І ПОЛЬШЧАЙ У ПАЧАТКУ 30-Х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ

**С. А. Фядзечка**

Нелегальная эміграцыя— з'ява, якая не ўзнікае імпульсіўна, а з'яўляецца паказчыкам істотных зменў жыцці грамадства.

У гісторыі Беларусі дастаткова прыкладаў міграцыі і эміграцыі. Асабліва вызначаўся ў гэтым сэнсе перыяд напрыканцы 19—пачатку 20-га стагоддзяў. Найбольш значнымі падзеямі ў гэтым радку былі:

1. Масавая міграцыя падчас сталыпінскіх рэформ ў Сібір (за 1904–1914 гг. з беларускіх губерняў выехала 356 378 чалавек), Паўднёвую і Паўночную Амерыкі ( за 1903–1913 гг. —1,5 млн. чалавек), Германію (у 1912 годзе там працавала 100 тыс. выхадцаў з беларускіх губерняў). [1] Трэба адзначыць, што ў апошніх двух выпадках мела месца звычайнае адыходніцтва, якое набыло такія формы дзякуючы капіталістычным зменам у беларускім грамадстве напрыканцы 19-га стагоддзя.

2. Перасяленне бежанцаў падчас Першай Сусветнай вайны на Усход (у пачатку кастрычніка 1915 г. каля Рэчыцы знаходзілася 64,000 бежанцаў, да пачатку 1916 года ў Мінскай губерніі асела больш за 157,000, у Віцебскай −90,000 бежанцаў. Усяго іх колькасць склала каля 1,500,000 чалавек). [2]

У міжваенны час працягвалася легальная эміграцыя ў Паўднёвую і Паўночную Амерыкі, якая мела пераважна эканамічныя карані і такім чынам не давала дастатковага ўяўлення аб сацыяльна-палітычных працэсах на тэрыторыі Беларусі.

Падзеі, якія адбываліся па абодва бакі польска-савецкай мяжы ў 1929–1933 гадах, надзвычай моцна абвастрылі супярэчнасці ў грамадстве. Калектывізацыя ў БССР і эканамічны крызіс у Польшчы вызначылі слаі грамадства, якія не ў стане былі існаваць на гэтых тэрыторыях.

Нелегальная эміграцыя 20–30-х гг. XX стагоддзя непараўнальна па маштабах з міграцыяй пачатку стагоддзя, але таксама патрабавала істотных умоў для яе пачатку. Па характары гэтага працэсу можна зрабіць вывады аб сацыяльна-палітычных і эканамічных працэсах у суседніх краінах, а таксама, разглядзеўшы нацыянальны склад эмігрантаў, вызначыць этнічны аспект праблемы.

Эміграцыя канцэнтравалася на Палессі з той нагоды, што мерапрыемствы па ахове дзяржаўнай мяжы—пагранічная стража і асаднікі ў Польшчы, пагранічныя войскі і чырвонаармейскіе калгасы ў СССР, давалі меньш плёну ў цяжкіх прыродных умовах беларускага Палесся.

Па выніках працы ў Дзяржаўным Архіве Брэсцкай вобласці (ДАБВ) можна вызначыць наступны ход падзей на беларуска-польскай мяжы ў 1930—1932 гг. *(гл. Табліцу 13).*

Перш за ўсё неабходна адзначыць, што дадзеныя аб перайшоўшых мяжу не былі апрацаваны па нейкаму стандарту ў храналагічнай ці іншай залежнасці. Справаводства Палескага Ваяводскага ўпраўлення (ПВУ) не падводзіла вынікаў эміграцыі па якіх-ці паказчыках, аддаючы перавагу разавым справаздачам па факту пераходу, спаралічна



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ